**А. Ярцев**

# Секта евангельских христиан

**Москва**
**«Книга по Требованию»**

УДК 291
ББК 86.3
А11

**А. Ярцев**
А11 Секта евангельских христиан / А. Ярцев – М.: Книга по Требованию, 2024. – 84 с.

**ISBN 978-5-458-61441-2**

Книга рассказывает о деятельности евангельских христиан до революции и в первые годы советской власти.

**ISBN 978-5-458-61441-2**

© Издание на русском языке, оформление
«YOYO Media», 2024
© Издание на русском языке, оцифровка,
«Книга по Требованию», 2024

Эта книга является репринтом оригинала, который мы создали специально для Вас, используя запатентованные технологии производства репринтных книг и печати по требованию.

Сначала мы отсканировали каждую страницу оригинала этой редкой книги на профессиональном оборудовании. Затем с помощью специально разработанных программ мы произвели очистку изображения от пятен, клякс, перегибов и попытались отбелить и выровнять каждую страницу книги. К сожалению, некоторые страницы нельзя вернуть в изначальное состояние, и если их было трудно читать в оригинале, то даже при цифровой реставрации их невозможно улучшить.

Разумеется, автоматизированная программная обработка репринтных книг – не самое лучшее решение для восстановления текста в его первозданном виде, однако, наша цель – вернуть читателю точную копию книги, которой может быть несколько веков.

Поэтому мы предупреждаем о возможных погрешностях восстановленного репринтного издания. В издании могут отсутствовать одна или несколько страниц текста, могут встретиться невыводимые пятна и кляксы, надписи на полях или подчеркивания в тексте, нечитаемые фрагменты текста или загибы страниц. Покупать или не покупать подобные издания – решать Вам, мы же делаем все возможное, чтобы редкие и ценные книги, еще недавно утраченные и несправедливо забытые, вновь стали доступными для всех читателей.

Серия Книжный Ренессанс
www.samizday.ru/reprint

тым і энэргічным пасьлядоўцай Рэдстока быў палкоўнік Пашкоў, імем якога звалася і самая сэкта. Усё сваё багацьце Пашкоў аддаў на справу прапаведваньня сэктанцтва і актыўна працаваў сам, покуль яго ня выслалі ў 1884 годзе заграніцу.

Асновай пашкоўскага вучэньня зьяўляецца догмат аб ачышчэньні грахоў асабістай верай у адпакутныя заслугі хрыста. Пашкоўцы вучылі, што ратуе ад грахоў не царква, ня таінства каяньня, а вера. І самыя добрыя справы ёсьць вынік гэтае веры. Інакш кажучы, яны прапаведвалі магчымасьць таго, што кожны можа выратавацца сам, толькі добра трэба вераваць. Пашкоўцы прызнавалі толькі сьвятое пісаньне, адмаўляючы сьвятое паданьне. Яны адмаўлялі абраднасьці, таінствы, інстытут прасьвітараў, абразы, мошчы, малітвы багародзіцы, крыж і хрышчэньне ў вадзе.

Такое вучэньне вельмі падобна да штундызму баптызму. Асноўная розьніца ў тым, што баптыстыя прызнаюць хрышчэньне ў вадзе для дарослых, прэламленьне хлеба і інстытут прасьвітараў. Да штундызму-ж вельмі падобна, за выключэньнем толькі асобных дробезяй.

Штундызм быў перанесены ў Расію з заграніцы ў пачатку 19 стагодзьдзя нямецкімі колёністымі. Некаторыя лічаць, што пашыраццa сярод расійскага насельніцтва штундызм пачаў з 1862 г., калі выступілі з вялікімі пропаведзямі Іван Рабашапка, Міхась Ратушны, Гараська Балабан і інш. Праз дзесяць год штундызм аб'яднаўся з баптызмам.

Але ня ўсе штундыстыя былі згодны з гэтым. Шмат хто з іх застаўся нездаволеным такімі ўступкамі ў пытаньнях хрышчэньня ў вадзе, прасьвітар'янцтве і інш. З-за гэтага частка штунды адыйшла, і стварыўся рад груп, якія мелі агульнае вучэньне, але існавалі паасобку. Галоўнейшыя з гэтых груп зваліся младоштундыстымі і эвангельскімі хрысьціянамі, вучэньне якіх блізка было да малаканаў уклеінскага ладу.

Існавалі паасобку штундысцкія групы доўга, на працягу некалькіх дзесяткаў год. Пасьля рэвалюцыі 1905 году ўзмацніліся спробы да аб'яднаньня. І потым быў створаны «Саюз эвангельскіх хрысьціян», да якога далучыліся і пашкоўцы. Але назвы груп існавалі. У паўднёвай Расіі эвангельскія хрысьціяне зваліся штундаэвангелістымі, у сярэдняй Расіі—пашкоўцамі. Саюз эвангельскіх хрысьціян поўнасьцю прыняў вучэньне пашкоўцаў.

На ўсерасійскім зьезьдзе ў 1910 годзе былі зроблены сур'ёзныя спробы да аб'яднаньня з баптыстымі. Гэтыя спробы пачаліся ў пашкоўцаў яшчэ ў 1907 годзе, калі было прынята (але лічылася не абавязковым) хрышчэньне ў вадзе, пралamленьне хлеба і прасьвітар'янцтва. Апошняе было прынята з агаворкай: «не прасьвітар (сьвяшчэньнік) кіруе царквою, а агульны сход хрысьціян і ён-жа мае першараднае значэньне ў жыцьці царквы». У 1911 годзе прадстаўнікі саюзу эвангельскіх хрысьціян прымаюць удзел на сусьветным конгрэсе баптыстых, а старшыня саюзу І. С. Праханаў быў абраны

віцэ-прэзыдэнтам баптысцкага інтэрнацыяналу і віцэ-прэзыдэнтам камітэту па прапагандзе ў Расіі. Быў устаноўлены нават вольны пераход з аднэй сэкты ў другую.

Аб'яднаньне асобных штундысцкіх груповак у адзін саюз спрыяла посьпеху новай арганізацыі. Знайшліся здольныя арганізатары, у асобе першага савету саюзу эвангельскіх хрысьціян. У яго ўваходзілі: І. С. Праханаў—інжынэр і кадэт па палітычных перакананьнях, у мінулым, прасьвітар С. А. Аляксееў, Г. М. Мацьвееў, В. І. Доўгаполаў, В. В. Хлопаў. Ужо да рэволюцыі меліся цэнтралізаваныя фонды: эвангельскіх даручэньняў, друку, асьветы, дабрачыннасьці і памяшканьняў. Выдаваўся часопіс «Христианин» і газэта «Утренняя Звезда», выдавалася масавая літаратура. Арганізоўваліся зьезды і гурткі моладзі, вялася падрыхтоўка прапаведніцкага актыву. Пропаведзь была шырока разгорнута і мела посьпехі.

Залучэньне новых сяброў ішло галоўным чынам за лік сялянства, гарадзкіх рамесьнікаў, саматужнікаў і дробных гандляроў. Пашырэньню спрыяў і царскі парадак. Групы насельніцтва, няздольныя да актыўнага змаганьня з царызмам, ішлі ў сэктанты, спадзяючыся знайсьці тут прадуху для нездавальненьня грамадзкім парадкам. Да эвангелістых ішлі і тыя групы і асобы, якія былі напалоханы рэволюцыяй 1905 году і бачылі ў царкоўнай рэформацыі сродак супроць усякіх рэволюцый. Калі першыя імкнуліся да матэрыяльнае роў-

насьці і да брацтва на зямлі, дык другія разумелі роўнасьць і брацтва «духоўна». Кіруючая частка складалася з прадстаўнікоў груп напалоханых рэволюцыяй і заядлых яе ворагаў. Яна і накіроўвала адпаведным чынам дзейнасьць усяго саюзу эвангельскіх хрысьціян. Гэтаму-ж спрыяла і само вучэньне эвангелістых, якое казала аб несупраціўленьні, веры ў «духоўнае перараджэньне».

Эвангельскія хрысьціяне, разам з баптыстымі, складалі да рэволюцыі правае крыло сэктанцтва[1]), супроць якога нават царскі ўрад ня ўжываў асаблівых уціскаў. Больш прасьледваліся нізы. Кіраўнікоў сэктанцтва не прасьледвалі. Заступніцтва перад міністэрствам унутраных спраў за эвангелістых, якіх прасьледвала мясцовае начальства, амаль заўсёды мела посьпех. Чым-жа гэта тлумачыцца?

Не разглядаючы падрабязна, мы прывядзем толькі вытрымку з аднэй «пісулькі» Праханава, якую пісаў ён прыблізна ў 1909 годзе. Гэтая «пісулька» прадстаўляе сабою цэлую програму, дзякуючы якой нам будуць зразумелы ў наступных разьдзелах адносіны эвангелістых да савецкае грамадзкасьці.

> «Гісторыя заходніх народаў паказвае, што ва ўсіх краінах, дзе мела месца рэформацыя, як: у Нямеччыне, Англіі, Швэйцарыі і інш., стваралася правільнае дзяржаўнае жыцьцё,

---

[1]). Пад словам „сэктанцтва" далей падразумяваецца ўвесь сэктанцкі рух у цэлым, усе сэкты, узятыя разам.

якое папярэджвала крывазыя рэволюцыі. А наадварот, у краінах, дзе рэформацыі рэлігійнай думкі ня было, дзе да гэтага часу ў душах народу пануе лад старой формальнай рэлігіі, якая шмат у чым незразумела для народу,—там і зараз няма такой роўнавагі ў народным жыцьці, і ва ўсякім выпадку, няма такога ўсебаковага і сталага руху наперад у ў народным жыцьці. Такім чынам, ня гледзячы на ўсю спагаднасьць політычных і экономічных рэформаў, вызваленьне нашага народу залежыць галоўным чынам ад абнаўленьня яго рэлігійнага жыцьця. Гэтае абнаўленьне атрымала на Захадзе назву рэформацыі. На жаль, само слова рэформацыя часта у нас разумеецца ў заходнім сэнсе і можа быць часам зразумета ў сэнсе насаджэньня чужаземнага дрэва ў Расіі. Але мы, прымаючы пад увагу гістарычнае значэньне рэформацыі, разумеем яе шырэй і глыбей: мы ўвязваем з ёю духоўнае абнаўленьне жыцьця народнага, але такое абнаўленьне, якое было-б самастойным праяўленьнем расійскага народнага духу».

Што відаць з гэтай вытрымкі? А відаць тое, што Праханаў лічыў царкоўную рэформацыю сродкам папярэджаньня рэволюцый, якія Праханаву былі, відаць, не да смаку. Уся вытрымка прасякнута нацыяналізмам, а прыклады бяруцца з «перадавых»

капіталістычных краін, дзе больш гнутка, чым у царскай Расіі, выкарыстоўвалі рэлігію, як лейцы для стрыманьня працоўных. Праханаў хацеў навучыць нашых былых кіраўнікоў таму, што даўно ведалі больш разумныя кіраўнікі на Захадзе. Вось у чым сэнс вытрымкі. Яна выяўляе палітычны твар Праханава—правадыра эвангелізму, надаючы гэтаму твару чыста кадэцкае аблічча.

Ды і ў найбольш левым разуменьні эвангелізм быў супроць актыўнага змаганьня з старым ладам, спадзяваўся на «добрых» памешчыкаў, «добрых» купцоў, фабрыкантаў і г. д.

Аднак, станоўчае значэньне яго да рэволюцыі ў тым, што на месцах, эвангелізм выклікаў жорсткую крытыку папоўшчыны, начальства, няроўнасьці і розных непарадкаў, прыцягваючы да гэтага ўвагу шырокіх пластоў працоўных. Эвангелізм дапамагаў разьвіхаць асновы царызму—і ў гэтым яго станоўчая роля. Адмоўнае-ж, што эвангелізм утрымліваў яго пасьлядоўцаў ад актыўнага змаганьня з царызмам. У гэтым—супярэчнасьці эвангелізму да рэволюцыі. Аб кіраўніках сэкты мы ўжо казалі.

У часе вайны ўзмацніліся прасьледваньні эвангельскіх хрысьціян і абмежаваньне іх дзейнасьці. Выклікала гэтае—толькі адмаўленьне ад страявой службы, у астатнім сэкта цалкам і сумленна падтрымлівала ўрад, які распачаў крывавую вайну. За выпадкі адмаўленьня ад страявой службы ўхапілася праваслаўнае духавенства, на чале з сіно-

дам, і пачалася шалёная траўля эвангелістых. Вось што пісаў, напрыклад, В. М. Скварцоў, адзін з правадыроў праваслаўных місіянэраў, член сінода.

> «Зьявіўся цэлы рад фактычных дакумантальных сьведчаньняў аб тым, што штундабаптызм і сэктанцкі эвангелізм у сутнасьці самога вучэньня заключае ў сабе супроцьдзяржаўныя догмы, і пасьлядоўцы гэтых сэктаў на вайне выявілі сябе адкрытымі здраднікамі цару і бацькаўшчыне і сябрамі тэўтонаў». («Колокол», 20 лютага 1915 г.).

Гэтая пагалоска была падхоплена і сэкта эвангельскіх хрысьціян дажыла да рэволюцыі, прайшоўшы перад гэтым праз рад гнаньняў, якія павялічылі яе станоўчае значэньне перад рэволюцыяй.

## Пасьля рэволюцыі

Саюз эвангельскіх хрысьціян і да рэволюцыі налічваў да 10 тысяч членаў, крыху меней за баптыстых, якіх налічвалася да 11 тысяч (паводле даных да 1910 году). Пасьля рэволюцыі эвангелізм расьце, што тлумачыцца новымі ўмовамі, якія спрыялі яго пашырэньню.

Нават пры лепшых, чым да іншых сэктаў, адносінах царызму да эвангелістых, яны ня мелі права вольна выступаць з пропаведзямі і залучаць у сваю сэкту. Пераход у сэктанты дазваляўся пасьля

падачы заявы губарнатару. Прапаганда сярод праваслаўных прасьледвался судом. Бязумоўна забаранялася распаўсюджваньне літаратуры. Урачыстае хрышчэньне ў вадзе магло дазволіць толькі міністэрства ўнутраных спраў.

Усе гэтыя і іншыя абмежаваньні, як толькі быў выданы дэкрэт аб вольнасьці сумленьня, адпалі. Пасьля рэволюцыі стварыўся рад іншых прычын, якія спрыялі пашырэньню эвангелізму. Закон вызваленьня ад вайсковае службы паводле рэлігійных пераканаяньняў, компромэтаваньне праваслаўнае царквы, аднабаковасьць бязбожнае работы, якая тлумачыцца ўмовамі першых год рэволюцыі, адозва Наркамзему да сэктантаў, якая заклікала да засяленьня былых памешчыцкіх зямель, супрацоўніцтва з баптыстымі да тае пары, пакуль гэтае сяброўства не зьмянілася варожасьцю,—вось гэтыя прычыны. Але важнейшая—«нейтральнасьць» серадняка ў часе захопу і першапачатковага ўмацаваньня рэволюцыйнае ўлады.

Разам з увядзеньнем нэпу адбываюцца зьмены ў суадносінах клясавых сіл. Комуністычная партыя, дзяржаўная ўлада трымаюць кірунак на серадняка, які зьяўляецца «цэнтральнай асобай земляробства». Асноўным лёзунгам высоўваецца саюз рабочае клясы і беднаты з сярэднім сялянствам. Але застаюцца і зьяўляюцца зноў новыя ўмовы, якія спрыяюць пашырэньню сэкты эвангелістых. Гэтыя ўмовы вынікаюць з распластаваньня вёскі і з недахопаў нашае работы на вёсцы.

Пры нэпе сэкта эвангелістых хрысьціян шпарчэй пашыраецца там, дзе мацнейшыя капіталістычныя адносіны, дзе больш выяўляецца ўплыў кулацтва. Адпаведна з гэтым разьмяркоўваюцца і раёны распаўсюджаньня сэкты.

У Цэнтральна-прамысловай вобласьці ўплыў нэпу, вольнасьць гандлю, рынку, расплатаваньне, выявіліся раней. Капіталістычныя адносіны раней адчуліся. Таму мы бачым, што ў Цэнтральна-прамысловай вобласьці ў першыя гады нэпу эвангельскія хрысьціяне пашыраюцца шпарчэй. На Украіне «уравнительность», паслабленьне кулака і пераход яго ў серадняки затрымаліся тым, што Украіна рад гадоў была пляцам грамадзянскай вайны. Група заможных і кулакоў увайшла ў нэп, як больш моцная чымся ў іншых месцах, што зрабіла Украіну асяродкам сэктанцтва, асабліва баптызму і эвангелізму. Зусім іншая справа ў Сібіры. Там бедната зьяўляецца больш значнай групай. Яе не задавальняюць надзеі на добраахвотнае параўнаньне і не захапляе сэктанцкая пропаганда.

Але калі на Цэнтральна-прамысловай вобласьці хутчэй адбіліся адмоўнасьці новай экономічнай політыкі, дык і элемэнты соцыялістычнага будаўніцтва тут хутчэй узрасьлі і ўзмацніліся. Соцыялістычныя элемэнты пачалі ўжо рашуча супроцьдзеяць сэктанцтву. Агульнаграмадзянская коопэрацыя, комуны і колгасы перагналі ў дасягненьнях і працы сэктанцкія комуны і колгасы. Уся праца на вёсцы значна палепшылася, а сялянства ўзрасло

як у гаспадарчых, так і культурных адносінах. Эвангелістыя аказаліся няздольнымі конкураваць з соцыялістычным будаўніцтвам.

Калі меркаваць, напрыклад, паводле Цьвярской губэрні, якая зьяўляецца аднэй з самых характэрных губэрняў у Цэнтральна-прамысловай вобласьці, дык можна зрабіць пэўны вывад аб глыбокім крызісе росту, які перажывае сэкта эвангельскіх хрысьціян. У гэтай губэрні ў сэкту эвангелістых за тры гады (1924—26) было прынята 702 члены, гэта значыць па 237 чалавек у сярэднім у год. Выключана і выбыла за гэты-ж час 115 чалавек, г. зн. па 38, прыкладна, у год. А ў 1927 годзе прынята 196, выбыла 113, або столькі, колькі за ўсе папярэднія тры гады. Фактычны прырост выявіўся ў 83 чалавекі і быў меншы сярэдняга гадавога прыросту папярэдніх гадоў на 113 чалавек. Разваліліся цэлыя групы. Выключалі адразу па 11 чалавек. Крызіс росту прызнаў і губэрскі зьезд эвангелістых, які наклаў на ўсё брацтва аднадзенны пост.

Дзякуючы таму, што соцыялістычнае будаўніцтва рашуча выкарчоўвае карэньні сэктанцтва, эвангельскія хрысьціяне пераносяць галоўную ўвагу на ўскраіны і нацыянальныя меншасьці. Яны заўзята організоўваюць там сваю справу, пасылаючы лепшых прапаведнікаў і адпускаючы вялікія сродкі.

Яны прыцягваюць увагу да ўскраін з боку брацтваў Цэнтральна-прамысловай вобласьці і Украі-